заўтра». Навуковец запатрабаваны на тэлебачанні, радыё, дзе асаблівую цікавасць выклікаюць яго расповеды пра абставіны падзей Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Выключнай рысай выкладчыка і навукоўца з'яўляецца яго добрасумленнасць, адданасць справе жыцця, памножаныя на відавочную любоў і павагу да сваіх вучняў. А яны, вучні, штораз вяртаюць настаўніку сваю ўдзячнасць не толькі за набытыя веды, але і за прыклад таго, якім павінен быць педагог.

Больш за тое, усе без выключэння калегі Івана Апанасавіча – а многія з іх лічаць яго сваім настаўнікам – не менш за студэнтаў удзячныя яму за відавочныя прыклады вернасці музе Кліа і чалавечай шчырасці, шчодрасці, сумленнасці ва ўсім. Калектыў гістарычнага факультэта, калегі па кафедры гісторыі Расіі зычаць юбіляру моцнага здароўя, працягу плённага спазнання таямніц мінулага!

***А. А. Яноўскі,***
кандыдат гістарычных навук, прафесар

# Міхаіл Фёдаравіч ШУМЕЙКА

# Mihail Fiodaravich SHUMEIKA



Споўнілася 65 гадоў кандыдату гістарычных навук, дацэнту, дацэнту кафедры крыніцазнаўства БДУ Міхаілу Фёдаравічу Шумейку.

Нарадзіўся М. Ф. Шумейка 20 жніўня 1952 г. у в. Верхняя Злобінка Почапскага раёна Бранскай вобласці (Расія). Па заканчэнні сярэдняй школы ў 1969 г. паступіў на факультэт архіўнай справы Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута (МДГАІ). Міхаіл Фёдаравіч Шумейка – вучань выдатнага навукоўца Сігурда Отавіча Шміта, знаёмства з якім не толькі шмат у чым прадвызначыла навуковы шлях юбіляра, але і стала для яго каштоўным асабістым здабыткам. Пасля паспяховага заканчэння адной з найлепшых устаноў вышэйшай адукацыі Савецкага Саюза ў 1974 г. малады гісторык-архівіст вярнуўся на Браншчыну, дзе непрацяглы час працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага архіва Бранскай вобласці. У 1974–1975 гг. служыў у Савецкай арміі. У 1976 г. заняў пасаду старшага навуковага супрацоўніка Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР, а ў 1977 г. – супрацоўніка Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР.

З 1977 г. навучаўся ў аспірантуры МДГАІ па спецыяльнасці «Крыніцазнаўства, гістарыяграфія, метады гістарычнага даследавання». У 1980 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Из истории выявления и собирания документов революционного движения в России второй половины XIX – начала XX в. (по материалам архива В. Я. Богучарского)».

У 1977–1991 гг. Міхаіл Фёдаравіч працаваў у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ (з кастрычніка 1990 г. – Інстытут гісторыка-палітычных даследаванняў КПБ). Калі ў 1991 г. на базе гэтай установы быў створаны Беларускі навукова-даследчы цэнтр дакументазнаўства і рэтраінфармацыі (сёння – Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС)),

М. Ф. Шумейка стаў намеснікам дырэктара гэтай наваствоpанай навуковай установы. Міхаіл Фёдаравіч і сёння не перарывае сувязі з БелНДІДАС, працуючы там вядучым навуковым супрацоўнікам.

З 1995 г. М. Ф. Шумейка пачаў выкладаць на гістарычным факультэце БДУ (з 1997 г. – на пастаяннай аснове) на пасадах дацэнта кафедры крыніцазнаўства, намесніка загадчыка кафедры крыніцазнаўства. У 2007 г. Міхаілу Фёдаравічу нададзена вучонае званне дацэнта. У 1990-я гг. ён быў адным з арганізатараў і нязменным куратарам падрыхтоўкі гісторыкаў-архівістаў на гістарычным факультэце БДУ. На пачатку 2000-х гг. М. Ф. Шумейка актыўна ўдзельнічаў у стварэнні дакументазнаўчага аддзялення на гістарычным факультэце. Юбілярам распрацаваны шэраг агульных і спецыяльных курсаў для студэнтаў розных спецыяльнасцей, падрыхтавана некалькі падручнікаў па архівазнаўстве і археаграфіі. Акрамя таго, М. Ф. Шумейка чытае курсы «Археаграфія», «Замежная археаграфія», «Архіўная рэстытуцыя» для студэнтаў першай ступені і курс «Сучасныя праблемы дакументазнаўства і архівазнаўства» для магістрантаў.

Важным напрамкам дзейнасці Міхаіла Фёдаравіча з’яляецца практычная археаграфія. З моманту стварэння ў 1999 г. у Беларусі Археаграфічнай камісіі ён актыўна ўдзельнічае ў яе працы. Сёння Міхаіл Фёдаравіч – старшыня Бюро Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Непасрэдна юбілярам або з яго ўдзелам падрыхтаваны цэлы шэраг дакументальных публікацый: «По воле народа. Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии» (1988), «Документальные памятники Советской Белоруссии» (1990), «Архіўная справа на Беларусі ў дакументах і матэрыялах (1921–1995 гг.)» (1996), «Первая всебелорусская конференция архивных работников, 12–15 мая 1924 г.» (1999), «1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии» (2005), «Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1945» (2005), «Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1941» (2006), «Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1945–1961» (2009), «Памяць і слава: Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – Уладзімір Іванавіч Пічэта» (2011), «Из истории архивов в Беларуси (1860-е гг. – 1960 г.)» (2015) і інш.

У кола асноўных навуковых інтарэсаў М. Ф. Шумейкі ўваходзяць архівазнаўства, археаграфія, крыніцазнаўства, палітычная і ваенная гісторыя Новага і Навейшага часу, пытанні захавання і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны. Міхаіл Фёдаравіч з’яўляўся кіраўніком шэрагу навуковых праектаў як у рамках дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, так і па лініі Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў. Ён аўтар каля 600 публікацый, у тым ліку некалькіх манаграфій: «Собрать рассеянное: о реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем» (1997), «Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло» (2002), «Белорусская археография в XIX–XX вв. (проблемы теории, истории, методики)» (2007), «Исторические и правовые аспекты реституции белорусских архивов» (2013). Прыемна адзначыць, што калі трымаеш у руках навуковае выданне, падрыхтаванае Міхаілам Фёдаравічам ці пад яго рэдакцыяй, можаш быць упэўненым у тым, што работа выканана на самым высокім навуковым узроўні.

Юбіляр не толькі сам актыўна займаецца навукай, але і ўцягвае ў даследчую работу моладзь, выступаючы навуковым кіраўніком дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Міхаіл Фёдаравіч падрыхтаваў чатырох кандыдатаў гістарычных навук (Ю. У. Несцяровіч, В. С. Іванова, Т. Д. Герновіч, В. В. Урублеўскі), вялікая праца праводзіцца ім і пры экспертызе дысертацый.

Акрамя таго, М. Ф. Шумейка – член савета гістарычнага факультэта БДУ, удзельнік працы вучэбна-метадычных аб’яднанняў па гуманітарнай адукацыі і адукацыі ў галіне кіравання, член вучоных саветаў БелНДІДАС, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. З’яўляўся членам экспертнай групы Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі.

Міхаіл Фёдаравіч з’яўляецца членам рэдакцыйных калегій шэрагу айчынных і замежных навуковых часопісаў і зборнікаў – «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя», «Архівы і справаводства», «Беларускі археаграфічны штогоднік», «Пам’ятки: археографічний щорічник», «Архіварыус» (зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў) і інш.

За дасягненні ў навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці адзначаўся разнастайнымі ўніверсітэцкімі, галіновымі і ведамаснымі ўзнагародамі, у тым ліку – нагруднымі знакамі «Ганаровы архівіст Беларусі» і «Выдатнік адукацыі». Міхаіл Фёдаравіч не проста прызнаны навуковец, вядомы як у Беларусі, так і за яе межамі, ён сапраўдны інтэлігент. У паўсядзённым жыцці гэта прыязны і добразычлівы чалавек, заўсёды здольны падтрымаць, даць добрую параду. Выключны прафесіяналізм і высокія чалавечыя якасці – падмурак аўтарытэту і павагі, якімі Міхаіл Фёдаравіч заслужана карыстаецца сярод навукоўцаў і студэнтаў. Калегі і сябры шчыра віншуюць Міхаіла Фёдаравіча з юбілеем і жадаюць яму здароўя, шчасця, дабрабыту, натхнення і новых здзяйсненняў.

***С. М. Ходзін,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***А. М. Назаранка,***
старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства